Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2018-03-23

## *Акцэнты тыдня:*

# краіна

Выбары ў Расіі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з пераканаўчай перамогай на выбарах Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. «Гэты вынік сведчыць аб высокім даверы і падтрымцы грамадзянамі Расіі ўзятага курсу на ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, умацаванне яе аўтарытэту на міжнароднай арэне. Упэўнены, што гістарычныя вузы дружбы і ўзаемаразумення нашых народаў стануць залогам далейшага пашырэння беларуска-расійскага стратэгічнага партнёрства», — гаворыцца ў віншаванні.

Плённая размова. Прэзідэнт Беларусі правёў сустрэчу з творчай моладдзю, у якой узялі ўдзел амаль 270 чалавек. Гэта студэнты рэспубліканскіх і рэгіянальных устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прадстаўнікі вядучых творчых калектываў і маладыя творчыя работнікі. На сустрэчу з кіраўніком дзяржавы былі запрошаны і педагогі, вучні якіх не раз станавіліся лаўрэатамі міжнародных конкурсаў, паспяхова займаюцца творчай і педагагічнай дзейнасцю ў сферы культуры.

Год малой радзімы. Міністэрствам інфармацыі Беларусі распрацаваны план па інфармацыйным суправаджэнні правядзення ў 2018 Года малой радзімы. Дзяржаўныя СМІ возьмуць актыўны ўдзел у яго рэалізацыі. Рыхтуюцца новыя тэматычныя рубрыкі ў друкаваных СМІ, выпуск спецыяльных публікацый і відэасюжэтаў на рэспубліканскіх і рэгіянальных тэлерадыёканалах. Спецыяльныя праекты, прысвечаныя Году малой радзімы, у прыватнасці, запланаваны Выдавецкім домам «Звязда» сумесна з Брэсцкім аблвыканкамам — «Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары», з грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» — «Край, дзе я жыву», з Магілёўскім аблвыканкамам — «Месца дзеяння» і «Вандроўка патрыётаў».

Праваслаўная кніга. Народ Беларусі робіць усё для падтрымання згоды і ўзаемаразумення ў сваёй краіне. Такую думку выказаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі падчас святкавання Дня праваслаўнай кнігі ў Духоўна-адукацыйным цэнтры ў Мінску. Уладыка адзначыў, што Беларусь мае багатую духоўную культуру, папулярызацыі і развіцці якой садзейнічае ў тым ліку правядзенне дзён праваслаўнай кнігі. Падобныя мерапрыемствы на працягу сакавіка ладзяцца ва ўсіх епархіях Беларускага экзархата, у публічных і царкоўных бібліятэках, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, а таксама ў духоўных школах БПЦ.

Спадчына. Міністэрствам культуры падчас нядаўняй калегіі прынята рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі падыходаў па стымуляванні ўдзелу фізічных і юрыдычных асоб у рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама захаванні аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны. У Мінкультуры лічаць, што мясцовыя органы ўлады, ведаючы сітуацыю знутры, могуць унесці прапановы, якім чынам стымуляваць інтарэс уласнікаў аб'ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Магчыма, гэта могуць быць пэўныя фінансавыя паслабленні.

Тым часам у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзентаваная серыя «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» у чатырох тамах. Фундаментальнае выданне, у якім адлюстраваная гісторыя культуры Беларусі ад Сярэднявечча да нашых дзён, стала вынікам шматгадовай працы навукоўцаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН. Вынікі навуковай працы будуць асновай для навуковага суправаджэння дзяржаўнай палітыкі развіцця нацыянальнай культуры, для фарміравання і ўдасканалення вучэбных праграм вышэйшых навучальных устаноў творчага і культуралагічнага кірункаў.

Стасункі. І Міжнародны форум духавога мастацтва «Фанфары Нядняшняга» адбыўся ў Стоўбцах, паведамілі ў Мінаблвыканкаме. Мэта — папулярызацыя духавой музыкі, падтрымка канцэртнай дзейнасці айчынных і замежных калектываў і выканаўцаў духавой музыкі. У межах форуму ладзілася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы развіцця духавога мастацтва Беларусі і замежных краін: гісторыя, тэорыя, арганізацыйна-творчыя аспекты».

***Агляд афіцыйных падзей ад***
**Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**